ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№17(1050) | ЧАЦВЕР, 13 лістапада 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ПЫТАННІ ІДЭАЛОГІІ– У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

У канцы кастрычніка ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспубліці Беларусь праведзены семінар "Удасканальванне ідэалагічнай і інфармацыйнай работы сярод студэнцкай моладзі", у якім прынялі ўдзел прарэктары, якія займаюцца пытаннямі ідэалогіі, інфармацыйнай і выхаваўчай работы. Перад імі выступілі міністр адукацыі краіны А.М. Радзькоў, яго намеснік Т.М. Кавалёва, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь С.Н. Князеў, якія расказалі аб палітыцы дзяржавы ў галіне адукацыі і выхавання. Заслуханы даклады вучоных Нацыянальнай акадэміі навук, кіраўнікоў Інстытутаў эканомікі, сацыялогіі НАН Б і інш.

На семінары адбылася прэзентацыя структурных падраздзяленняў Маладзёжнага цэнтра і грамадскіх студэнцкіх арганізацый Акадэміі кіравання, сустрэча з яго актывам у рамках прэс-канферэнцыі "Прамы кантакт".

* * *

У рамках павышэння кваліфікацыі прарэктараў, якія займаюцца пытаннямі ідэалогіі, інфармацыйнай і выхаваўчай работы, у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адбылася навукова-практычная канферэнцыя "Ідэалагічная і выхаваўчая работа ў ВНУ на сучасным этапе". На ёй разгледжаны асаблівасці ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў ВНУ, Закон Рэспублікі Беларусь "Аб вышэйшай адукацыі" у кантэксце ідэалогіі беларускай дзяржавы, светапоглядавыя і маральныя аспекты ідэалагічнай работы ў ВНУ.

Удзел у рабоце семінара і навукова-практычнай канферэнцыі прымаў прарэктар па выхаваўчай рабоце нашага універсітэта А.В. Лысянкоў.

**Да 60-годдзя вызвалення г. Гомеля, Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

## УРОКІ МУЖНАСЦІ І ПАМЯЦІ

**У гонар знамянальных дат ва універсітэце прайшлі сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.**

Перад першакурснікамі філалагічнага факультэта выступілі палкоўнік у адстаўцы Рыгор Сямёнавіч Мільчанка, які абараняў г. Ленінград. Яго расказ аб абаронцах блакаднага горада, аб голадзе, холадзе, якія давялося перажыць яго жыхарам, быў урокам памяці. Цаной жыцця воінаў Савецкай Арміі і мірнага насельніцтва (ад голаду і холаду памерла 632 тысячы) горад адстаялі. Рыгор Сямёнавіч прачытаў свае вершы і верш Ю. Воранава "Блакада".







Пранікнёны расказ палкоўніка ў адстаўцы Мікалая Пятровіча Шкарбуна аб абароне гарадоў Марыупаля, Сталінграда, вызваленні Украіны, аб ваенных гадах ліхалецця, подзвігу савецкага народа глыбока запаў у душу ўсіх удзельнікаў сустрэчы.

Крывёю, потам, незлічонымі ахвярамі дасталася перамога. Аб гэтым быў расказ ветэрана, палкоўніка ў адстаўцы Уладзіміра Іусцінавіча Клыгі, які выступіў таксама і перад студэнтамі 1 курса геолага-геаграфічнага факультэта. Вайна для яго пачалася ў 16 гадоў. Добраахвотнікам ён трапіў на фронт, вызваляў Беларусь, прайшоў усю вайну, потым стаў кадравым ваенным, а пасля адстаўкі – выкладчыкам філасофіі БелДУТа.

Студэнткі філфака Галіна Астапенка, Нора Гянук, геолага-геаграфічнага факультэта – Каця Фёдарава, Алена Пісар, Таня Пузевіч прачыталі вершы ў гонар ветэранаў, а група будучых філолагаў выканала песню.

Моладзь горача і сардэчна падзякавала ветэранаў за іх успаміны, гераізм і мужнасць у імя нашага сённяшняга шчаслівага жыцця, ім былі ўручаны букеты пунсовых гваздзікоў.

Гэтыя сустрэчы сталі ўрокамі мужнасці, міру, памяці аб загінуўшых. Мір неабходна берагчы, а калі трэба – умець яго адстаяць.

У гонар знамянальных дат на першых курсах філалагічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў у верасні-кастрычніку адбыліся таксама экскурсіі ў музеі, карцінныя галерэі, паркавы ансамбль г. Гомеля. Запланаваны тэматычныя і навукова-тэарэтычныя канферэнцыі, гутаркі і іншыя мерапрыемствы.

**Т. ЯЗЭПАВА,**
**дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.**

**На здымках: перад студэнцкай моладдзю выступаюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны У.І. Клыга (уверсе) і М.П. Шкарбун.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## АДБУДЗЕЦЦА СТУДЭНЦКІ ФОРУМ

У хуткім часе ў г. Мінску плануецца правядзенне Рэспубліканскага студэнцкага форуму. Яго мэта – узмацненне сацыяльнай абароненасці студэнцтва, пашырэнне яго ўдзелу ў вырашэнні эканамічных, сацыяльных і культурных праблем грамадства, зварот на актуальныя пытанні жыцця студэнтаў адпаведных міністэрстваў, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых улад, грамадскіх аб'яднанняў.

Падрыхтоўка да гэтага важнага і маштабнага мерапрыемства, удзел у якім прымуць студэнты як дзяржаўных, так і недзяржаўных ВНУ краіны, а таксама прадстаўнікі БРСМ, прафсаюзных арганізацый, актыўна вядзецца па ўсёй рэспубліцы. Сфарміраваны аргкамітэты, праведзены студэнцкія канферэнцыі, на якіх абраны дэлегаты форума.

У аргкамітэт, які створаны ў нашым універсітэце, увайшлі прарэктар па выхаваўчай рабоце А.В. Лысянкоў (старшыня), начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю Г.І. Варонін, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ І.А. Казакоў, старшыня прафкама студэнтаў Н.І. Колтышава і яе намеснік Т.У. Маслава.

Ад кожнага факультэта, а таксама грамадскіх арганізацый ГДУ на форум вылучаны 24 прадстаўнікі.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Чарговае пасяджэнне Савета ГДУ адбылося 30 кастрычніка. Першым на яго парадку дня па інфармацыі дэкана завочнага факультэта, намесніка старшыні НМС М.Н. Мурашкі абмеркаваны вынікі работы навукова-метадычнага савета універсітэта ў мінулым навучальным годзе. Намечаны асноўныя задачы на бягучы, 2003-2004 г.

Прафесару кафедры вышэйшай матэматыкі М.В. Селькіну прысвоена званне "Ганаровы прафесар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны".

Аб выніках работы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, аб бакалаўрскай падрыхтоўцы беларускіх студэнтаў у бягучым навучальным годзе Савету далажыла начальнік вучэбнага аддзела Н.І. Папкова.

Абмеркаваны кандыдатуры аспірантаў, вылучаных на прысуджэнне стыпендыі Урада Рэспублікі Беларусь. Па гэтым пытанні выступіла заг. аспірантуры С.Ф. Зобава.

З інфармацыяй аб рэкамендаванні 49 студэнцкіх навуковых работ на Рэспубліканскі конкурс па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках 2003 г. выступіў вядучы інжынер НДС А.В. Гаеў.

Унесены дапаўненні ў Палажэнне аб платным навучанні ў ГДУ імя Ф. Скарыны, у Калектыўны дагавор на 2002-2004 гады, з якімі членаў Савета азнаёміла нам. начальніка планава-фінансавага аддзела В.В. Любезная.

Юрысконсульт М.П. Колтышава праінфармавала аб зменах, якія ўносяцца ў Статут ГДУ імя Ф. Скарыны.

Аб адкрыцці навукова-даследчых лабараторый, ЧНК паведаміў начальнік НДС В.Р. Сафонаў.

На вакантныя пасады выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў, разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ПРЕЕМСТВЕННОСТЬ ЛУЧШИХ ТРАДИЦИЙ

***29 октября исполнилось 85 лет Всесоюзному Ленинскому Коммунистическому Союзу Молодежи.***

Этой дате были посвящены праздничные мероприятия, в которых принимали участие не только ветераны комсомольского движения, но и их молодые преемники – члены Белорусского республиканского союза молодежи.

Мероприятия в г. Гомеле 29 октября начались с возложения цветов к памятникам комсомольцам-освободителям на улице Жарковского и к Вечному огню.

В этот же день в г. Минске во Дворце республики прошел торжественный вечер, в котором принял участие Президент Республики Беларусь А.Г. Лукашенко. Комсомол был самой массовой молодежной организацией в истории нашего отечества, подчеркнул белорусский лидер. Молодежь и власть непременно должны взаимодействовать, чтобы совместными усилиями достигать намеченных целей. Президент поставил задачу перед БРСМ: стать основной определяющей организацией, которая могла бы решать молодежные проблемы. За достижения в социально-культурном развитии Александр Лукашенко вручил БРСМ Почетное государственное знамя Республики Беларусь.

30 октября в нашем университете прошел торжественный вечер, посвященный 85-летию ВЛКСМ. Его организовали Центральная районная организация БРСМ и комитет первичной организации БРСМ ГГУ. Участники вечера вспомнили историю, которую прошел комсомол, поздравили комсомольцев старшего поколения, славную эстафету приняли у них первокурсники, которым вручили билеты Белорусского республиканского союза молодежи. Члены БРСМ пообещали с честью продолжать историю, хранить традиции Знамени дважды орденоносного комсомола, стремиться сделать все возможное для развития и процветания Беларуси.

Кульминацией празднования 85-летия ВЛКСМ в Гомеле стала встреча комсомольцев разных поколений, которая прошла 1 ноября в областном общественно-культурном центре.

**И КАЗАКОВ,**
**секретарь первичной организации БРСМ ГГУ.**

## Віншуем!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты факультэта фізічнай культуры горача віншуюць дэкана названага факультэта **НАРСКІНА Генадзя Іванавіча** з прысуджэннем яму прэзідыумам ВАКа Расіі вучонай ступені доктара педагагічных навук.*

***

*За вялікі асабісты ўклад у арганізацыю і правядзенне міжнародных школ-семінараў па актуальных праблемах фізікі мікрасвету Гомельскі абласны выканаўчы камітэт аб'явіў падзяку **АНДРЭЕВУ Віктару Васільевічу** – дацэнту кафедры тэарэтычнай фізікі.*

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры матэматычнага аналізу **ЮШЧАНКА Дзмітрый Пятровіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

***

*За шматгадовую добрасумленную працу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці загадчыца склада **ВАРАПАЕВА Валянціна Васільеўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

## СТУДЕНТЫ XXI ВЕКА

Под таким названием в конце октября на базе нашего университета проходил семинар, который был организован членами английского клуба и первичной организацией БРСМ ГГУ. В нем приняли участие делегаты из вузов Минска, Гродно, Витебска, Бреста.

Предметом обсуждения были такие актуальные темы, как борьба с курением, с распространением СПИДА, с прогулами занятий в вузах. Общение студентов проходило на английском, так как основными целями семинара были практика иностранного языка и культурный обмен между учебными заведениями Беларуси.

Обсуждение проходило в три этапа: знакомство; работа в комитетах, где каждая группа вырабатывала основную концепцию и возможное решение выбранной проблемы; в заключение состоялись совместные дебаты и были объявлены конечные результаты.

Студенты факультета иностранных языков Е. Новак, А. Богданович, О. Барботкина от имени организаторов семинара выражают огромную благодарность за помощь в его проведении секретарю первичной организации БРСМ И. Казакову, председателю профкома студентов Н.И. Колтышевой, Партии Народного Согласия. Они также надеются, что такие семинары в нашем университете станут доброй традицией.

Нашы юбіляры

# "ТВОЙ СМУТАК – ЛЁГКІ МАТЫЛЁК..."



**Жыццёвы дзённік Віктара Уладзіміравіча Ярца, знакамітага паэта, крытыка і публіцыста, папоўніўся двума пяцёркамі. Гэта своеасаблівы юбілей, вяршыня чалавечай мудрасці, творчых дасягненняў, спраўджаных надзей. Вельмі хацелася б спадзявацца на тое, каб жыццёвы шлях гэтага чалавека заўсёды быў светлым і новыя творы паэта радавалі яго сяброў і прыхільнікаў.**

Калі ўважліва чытаць вершы Віктара Ярца, можна заўважыць іх строгую ўпарадкаванасць, мяккі лірызм, вобразнасць, змястоўнасць, высокую тэхніку вершаскладання. Кожнае слоўка нагадвае адшліфаваную залацінку, якая стварае яркі вяночак вобразных паэтычных сюжэтаў. Вось яны: "Ластаўка руплівая, як маці", "Сонца смажыць лісце лазняку", "У вачах тваіх узыходзіць раніца", "З-пад рукі тваёй узлятае дзень"...

Асэнсоўваеш гэтыя радкі і адчуваеш іх філасофскі сэнс, непарыўную еднасць з роднай прыродай, адпаведны стан душы творцы, яго імкненні і хваляванні.

Відавочна, таму і з'яўляецца пільная патрэба, каб болей ведаць пра аўтара, пра ягонае жыццё, творчасць, працоўную дзейнасць. Бо кнігі В.У. Ярца, на мой погляд, дапамагаюць фарміраваць сапраўднага грамадзяніна нашай суверэннай дзяржавы, які з цягам часу зможа дакладна асэнсаваць сваё прызначэнне на Зямлі, вызначыць правільныя арыенціры.

Дык хто ж такі Віктар Ярац? Звычайны і незвычайны. Абаяльны. Строгі. Працавіты. Палымяны прамоўца. І вельмі таленавіты, які сціпла адносіцца да сваёй асобы, не набываючы, як некаторыя, "зоркавую хваробу". Самае цікавае, што гэты паэт – вядомы і прызнаны ў народзе, з прыхільнасцю адносіцца да пачаткоўцаў. І калі трэба, дапамагае цёплым словам, слушнай парадай.

Магічным крышталікам для В.У. Ярца з'яўляецца яго родны кут – пасёлак Чырвоны Мост Рэчыцкага раёна. Тут ён нарадзіўся, бегаў басанож, асвойваў нялёгкую сялянскую працу. Зялёны бераг дзяцінства, зразумела, заўсёды прыцягальны і непаўторны.

"... А мясціны нашы прыгожыя! – прызнаўся неяк у сваёй аўтабіяграфіі паэт. – Крутыя стромы Дняпра, шырокія заліўныя лугі, за якімі – ягадныя сасновыя бары, што йдуць ля самай рэчкі, дорачы ёй свой водар, настой такіх сціплых і таямніча цудадзейных зёлак, кветак, раслін."

Вядома ж, дзіўнае хараство навакольнага свету глыбока западае ў юначае сэрца, сагравае і дапамагае ў ліхую часіну. Убачанае і перажытае занатуецца ў памяці, адлюструецца ў паэзіі. Да прыкладу, у такіх паэтычных зборніках, як "Уваходзіны" (1976 г.), "Добрыца" (1989 г.), "Дняпроўскі бакен" (1992 г.) і інш.

Давялося Віктару Ярцу, актыўнаму селькору, пасля заканчэння сярэдняй школы "паспытаць" журналісцкага хлеба. Яго тады запрасілі на працу ў раённую газету "Дняпровец". Такі давер узвышаў юнака ў вачах сваіх настаўнікаў і сяброў. Але Віктар добра разумеў: каб не стаць дылетантам, неабходна папоўніць жыццёвую скарбонку новымі ведамі.

Вучоба ў прэстыжным БДУ імя Леніна паспрыяла сустрэчы з цікавымі хлопцамі і дзяўчатамі, у далейшым вядомымі творцамі. Гэта – Уладзімір Дзюба, Генрых Далідовіч, Яўгенія Янішчыц, Юрка Голуб, Алесь Разанаў... Потым ён стаў студэнтам Гомельскага дзяржуніверсітэта, які закончыў у 1970 годзе. Зноў была праца ў раёнцы "Камунар", служба ў Савецкай Арміі, клапатлівая справа на гомельскай студыі тэлебачання, вучоба ў аспірантуры, абарона дысертацыі...

Шмат прабегла гадочкаў з таго часу, як малады выкладчык увайшоў у студэнцкую аўдыторыю. Больш за 30 гадоў шчыруе В.У. Ярац на кафедры беларускай літаратуры ў ГДУ імя Ф. Скарыны. І не сядзеў, вобразна кажучы, склаўшы рукі, а надрукаваў кнігі, шмат артыкулаў, рэцэнзій, тэзісаў у часопісах, газетах, энцыклапедыях і зборніках Беларусі, Расіі і Украіны. У свой час Віктар Уладзіміравіч кіраваў літаб'яднаннем "Крыніца", з якога "выпырхнулі" ў свет вядомыя цяпер паэты і празаікі Эдуард Акулін, Вольга Куртаніч, Анатоль Зэкаў, Анатоль Сыс, Алесь Бяляцкі, Анатоль Казлоў і іншыя.

... У народзе кажуць: "Гады – не пуды! За плячыма іх не носяць". І сапраўды: 55-ць не надта шмат! Асабліва для творчага чалавека. Так што, ваш смутак – лёгкі матылёк, які не бачыцца здалёк.

Удачы Вам, Віктар Уладзіміравіч, здароўя і добрых новых твораў!

**Ганна АТРОШЧАНКА.**

❖❖❖

**Віктар ЯРАЦ**

## ПАД НЕБАМ ПРОДКАЎ

*... Тут са стронцыем*
*маліўся вецер,*
*тут з плутоніем*
*маліўся снег*
*за каго на гэтым*
*белым свеце*
*і за чый,*
*чарней ад хмары,*
*грэх?*

Размышление



Холодные капли осеннего дождя ударяются о крыши домов, барабанят по стеклу, будто пытаясь сказать что-то, позвать на улицу. Я выхожу. Небо осыпает меня про-

# ОСЕННИЙ ДОЖДЬ

зрачным и хрупким хрусталем дождя, отражая в каждой капле улыбку наступающей осени. Подставляю дождю лицо. Пусть он смоет с него усталость и тоску, заменив их беспечной улыбкой.

Проживая свою короткую жизнь, капли успевают насладиться ею. Разбиваясь о мостовую и звеня стеклянными пылинками, они вспоминают свое рождение из тучи, восхитительный полет, лица прохожих, прятавшихся под крышами домов. Люди были без зонтов, они не ожидали, что осенние тучи так скоро изрешетятся жгуче-холодным бисером дождя. Я не ухожу. Стою и думаю о том, что хорошо бы и людям научиться так блистательно и безгрешно проживать свой век.

Несколько капель упало на мои ресницы, в них отразились мои мысли. Я хотела рассказать об этом людям, но они не стали слушать меня.

Кто-то наверху залатал тучу пухом облаков, дождь прекратился. Шум города вернул меня в грустную реальность. На дороге появились холодные осенние ручейки. Оторвавшийся лист клена тоскливо плыл по одному из них. На листке блестели капли дождя. Подождите меня, верните в мечту!.. Но, увы, они не услышали, уплыли, поглощенные созерцанием своей красоты.

Не услышали, не подождали... Как люди.

Скоро вновь пошел дождь, но он не подарил мне романтически-задумчивого настроения. Я лишь промокла и замерзла.

**Марина ДЖАЛАЯ.**

Для отдыха и лечения

# ВАС ЖДУТ В «СОЛНЕЧНОМ»

**Санаторий «Солнечный» – одна из старейших здравниц Беларуси. Он расположен в 10 км от г. Гомеля в чистой загородной зоне п. Ченки на берегу реки Сож, в сосновом бору.**

Профиль санатория: лечение заболеваний нервной, костно-мышечной, сердечно-сосудистой систем, органов пищеварения. Для этого широко используются и природные факторы – климатолечение и минеральная вода.

В санатории можно получить различные лечебно-оздоровительные процедуры: ванны (минеральные, хвойные, йодобромные, жемчужные, вихревые), души (циркулярный, Шарко, восходящий, подводный душ-массаж), есть также сауна. В кабинетах теплолечения, физиотерапии вам предложат озокерито-парафиновые аппликации и электрогрязефорез, ультразвуковую терапию, светолечение, электросон и др. К вашим услугам также кабинеты массажа, иглорефлексотерапии, психотерапии, фитотерапии (5-6 видов травяных настоев), лечебной физкультуры с тренажерным залом, ингаляторий. Можно получить также консультации различных врачей-специалистов, пройти диагностическое обследование.

В санатории есть также отделение реабилитации постинфарктных больных. Питание – диетическое, заказное, 5-разовое (для детей – 6-разовое).

**По вопросам приобретения путевок в санаторий «Солнечный» обращайтесь в профком ГГУ. тел. 57-19-22.**



Апошні ліст. Фотаэцюд У. Чысніка.

Ваш досуг

**СМОТРИТЕ В КИНОТЕАТРЕ «ЮБИЛЕЙНЫЙ»:**

**13-16 ноября:** (Премьера) приключения **«Двойной форсаж»** (США). Начало – 17.00, 19.00. Цена билета: 1500 руб.

**19-23 ноября:** приключения **«Клад»** (США). Начало – 17.00. Цена билета: 1000 руб.

Боевик **«Раскаленная суббота»** (Россия). Начало – 19.00. Цена билета: 1000 руб.

**26-30 ноября:** мелодрама **«Роковая связь»** (США). Начало – 17.00. Цена билета: 1000 руб.

Боевик **«Последний отсчет»** (США). Начало – 19.00. Цена билета: 1000 руб.

**Киносеансы для детей:**

**15-16 ноября:** приключения **«Малыш карате»** (США). Начало – 14.00.

**22-23 ноября:** мультсборник **«Война мышонка и лягушонка»** (Чехия). Начало – 14.00.

**29-30 ноября:** приключения, комедия **«Двое: я и моя тень»** (США). Начало – 14.00.

Цена билета: для детей – 300 руб., для взрослых – 600 руб.

**Автоответчик: 57-56-69.**

# ВНИМАНИЮ СЛУШАТЕЛЕЙ ИПК И ПК

В связи с изменением ставки I разряда (Постановление Совета Министров Республики Беларусь №1220 от 26.09.03 г.) плата за обучение в Институте повышения квалификации и переподготовки кадров по вечерней форме обучения с 1.09.03 г. составляет: специальность «Английский язык»: первый год обучения — 37 770, второй год обучения – 35 860; специальность «Экономика и управление на предприятии»: соответственно – 36 690 и 37 350; специальность «Правоведение» – 36 270 и 37 570; специальность «Практическая психология» – 26 030 и 36 450 тыс. руб.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

– рускай літаратуры – дацэнта, старшага выкладчыка;

– матэматычных праблем кіравання – заг. кафедры;

– бухуліку, кантролю і АГД – старшага выкладчыка;

– нямецкай мовы – старшага выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

Мудрые советы

# ЧТОБЫ ЖИТЬ ЛУЧШЕ ...

ПРАВИЛО ПЕРВОЕ. Каждый раз, когда вы совершаете ошибку или терпите неудачу, не размышляйте об этом слишком долго. Люди учатся на своих ошибках. Способность совершать промахи неотделима от способности достигать поставленной цели. Никто не побеждает всегда, и ваши неудачи являются составной частью и необходимым условием вашего развития. Не переживайте из-за оплошностей. Как бы вы узнали пределы своих сил, если бы время от времени не терпели неудачи? Не оставляйте стараний, и успех придет к вам.

ПРАВИЛО ВТОРОЕ. Стройте каждый день на фундаменте из приятных мыслей. Не горюйте о своих недостатках, реальных или воображаемых.

Вы можете летать, если поверите, что можете это делать. Даже не рассматривайте возможность поражения. Пусть ваши сокровенные мечты воплотятся в действительность. Улыбайтесь!

ПРАВИЛО ТРЕТЬЕ. Пусть ваши поступки говорят за вас, но всегда будьте начеку и избегайте ужасных ловушек ложной гордости и самомнения, подстерегающих вас на пути. Когда вам в следующий раз захочется похвастаться, съешьте бублик: дырка, оставшаяся от него, будет истинным мерилом вашего самомнения.

ПРАВИЛО ЧЕТВЕРТОЕ. Вы никогда не сможете победить, кутаясь в рубище жалости к себе, а унылые причитания отпугнут любую возможность успеха. Вы заслуживаете лучшей участи.

ПРАВИЛО ПЯТОЕ. Живите этот день так, как если бы он был последним в вашей жизни. Забудьте о вчерашних поражениях и не обращайте внимания на завтрашние проблемы... Возьмите эстафетную палочку и бегите вперед. Это ваш день!

ПРАВИЛО ШЕСТОЕ. Смейтесь над жизнью и над собой. Не в духе уничижения или жалости к себе – нет, смех должен быть лекарством, чудодейственным средством, облегчающим ваши страдания, избавляющим от депрессии и помогающим поместить в надлежащую перспективу все то, что тяготит вас в настоящий момент. Когда вам тяжело, прогоняйте смехом напряженность, тревогу и беспокойство, освобождая свой разум, чтобы мыслить ясно и найти решение, которое всегда существует. Не относитесь к себе слишком серьезно.

ПРАВИЛО СЕДЬМОЕ. Вы осуществите свою великую мечту, если будете двигаться к ней день за днем, поэтому ставьте цели на каждый день: не сложные и длительные проекты, но необходимые дела, которые шаг за шагом приведут вас к вершине радуги. Записывайте их, если вам так проще, но ограничивайте свой список так, чтобы не пришлось откладывать сегодняшние незавершенные дела на завтра. Помните, что нельзя построить пирамиду за двадцать четыре часа. Будьте терпеливы. Не забивайте рабочие часы посторонними вещами, уводящими вас в сторону от главной цели – сделать все наилучшим образом, радостно прожить этот день и испытать удовлетворение от того, что вы совершили.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта фізічнай культуры, калектыў кафедры фізвыхавання і спорту выказваюць глыбокае спачуванне ст.выкладчыку **КАЛАЧОВУ Віктару Віктаравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта замежных моў, калектыў кафедры французскай мовы выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку названай кафедры **КАЛАЦЭЙ Святлане Мікалаеўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **БРАТА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г.
Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4487
Падпісана да друку 11.11.2003 г.